Навучэнцы гродзенскай семінарыі ўшанавалі рэліквіі бл. Міхала Сапоцькі

Аўтар: кл. Яўген Амасёнак
08.02.2015 01:00



“Гэта святар паводле Майго сэрца, Мне падабаюцца ягоныя намаганні”.
Св. Фаўстына Кавальская З нагоды святкавання 25-гадовага юбілею заснавання семінарыі клерыкі на чале з кс. біскупам Юзафам Станеўскім і кс. рэктарам Раманам Рачко сустрэлі рэліквіі і абраз вядомага і шанаванага ў нашай краіне бласлаўлёнага кс. Міхала Сапоцькі.

Дзякуючы рэкалекцыяністу кс. Яну Пузыну, вельмі прасякнутаму духоўнасцю кс. Міхала Сапоцькі, семінарысты мелі магчымасць не толькі фізічна, але і духоўна дакрануцца да спадчыны Бласлаўлёнага і паразважаць над яго жыццём і думкамі.

Бласлаўлёны Міхал Сапоцька, святар, апостал Божай Міласэрнасці, спавядальнік і духоўны айцец св. Фаўстыны Кавальскай, тэолаг, руплівы душпастар, выхавацель святароў велічна ўпісаны ў гісторыю паўсюднага Касцёла. Магчыма, менавіта ў той час Езус патрабаваў чалавека, які сваімі намаганнямі пацвердзіў бы тую праўду, аб якой казала св. Фаўстына Кавальская. Кс. Міхал з пакорай прыняў гэтае заданне і застаўся верны пасланню Хрыста да канца свайго жыцця. Але за сваю вернасць ён павінен быў плаціць няспынным цярпеннем: слухаць зласлівыя заўвагі, бачыць іранічныя ўсмешкі і нават сутыкацца з непаразуменнем з боку ўлады Касцёла. Але Божая ласка аказалася мацнейшай за чалавечыя слабасці. †

Навучэнцы гродзенскай семінарыі ўшанавалі рэліквіі бл. Міхала Сапоцькі

Аўтар: кл. Яўген Амасёнак
08.02.2015 01:00

